«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

Гомель спрабуюць зачысціць ад незалежных журналістаў перад прыездам прэзідэнтаў

24.10.2018 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода слова



Будынак Гомельскага аблвыканкама. Фота: Радыё Свабода.

Буда-Кашалёўскі раённы суд выклікае на разгляд адміністрацыйных пратаколаў двух журналістаў-фрылансераў з Гомеля: 25 кастрычніка – **Андрэя Толчына**, 26 кастрычніка – **Кастуся Жукоўскага**. Інфармацыю перадае Служба маніторынгу ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў"

> *"Улады прыдумалі так, каб нейтралізаваць нас да прыезду Аляксандра Лукашэнкі і Пятра Парашэнкі ў Гомель на першы Форум рэгіёнаў Беларусі і Украіны"*, – лічыць Кастусь Жукоўскі.

Гэта выглядае цалкам праўдападобна, бо адміністрацыйны пратакол за незаконны выраб прадукцыі СМІ без акрэдытацыі для спадарожнікавага тэлеканала “Белсат” складзены мясцовай міліцыяй за адзін і той жа відэасюжэт – “На будоўлю ў Буда-Кашалёве вязуць пясок з халерных могілак”. Сюжэт гэты быў паказаны 25 жніўня. У ім ішла гаворка пра тое, што ў Буда-Кашалёве на будоўлі выкарыстоўваюць пясок, у якім знаходзяць чалавечыя парэшткі.


Як высветлілі журналісты, пясок у райцэнтр возяць з колішняга паселішча Царкоўе, што за 40 кіламетраў ад Буда-Кашалёва. Мясцовыя жыхары распавядаюць, што акурат у тым месцы ў 18-м стагоддзі былі пахаванні ахвяраў халернай эпідэміі. За савецкім часам з Царкоўя таксама спрабавалі браць пясок, але, дазнаўшыся пра халернае пахаванне, адмовіліся ад раскопак.

Юрыст ГА “БАЖ” з Гомеля **Леанід Судаленка** мяркуе, што адміністрацыйныя справы паводле часткі 2, артыкулуа 22.9 КаАП у дачыненні журналістаў-фрылансераў Буда-Кашалёўскі раённы суд хутчэй за ўсё спыніць, бо 24 кастрычніка сыходзіць двухмесячны тэрмін, цягам якога парушальнікаў можна прыцягваць да адміністрацыйнай адказнасці.

Опубликовать








Праваабаронца Наталля Сацункевіч: "Задача грамадскіх назіральнікаў — прымусіць сістэму выконваць правілы"

У Баранавічах за ўдзел у паслявыбарчых акцыях пратэсту дзевяць чалавек асудзілі да калоніі

Заява аб прызнанні 13 чалавек палітычнымі зняволенымі

Жанчыну асудзілі па фота з Маршаў, якія захаваліся на воблачным сховішчы яе тэлефона




ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

Працягваецца ціск у зняволенні: агляд навінаў пра палітвязняў з 27 сакавіка па 11 красавіка

Працягваецца ціск у зняволенні: агляд навінаў пра палітвязняў з 12 па 27 сакавіка

Беларусы на "крытай": як палітвязняў працягваюць пераследаваць у калоніях (дапоўнена)

"Гэтыя каштоўнасці не прыбраць". Як экс-палітвязні святкавалі Дзень волі ў няволі




ГАЛОЎНАЕ

Праваабаронца Наталля Сацункевіч: "Задача







АПОШНІЯ НАВІНЫ

У брэсцкім СІЗА памёр Аляксандр Кулініч, якога абвінавачвалі ў абразе Лукашэнкі

"Следчая адвярнулася да сцяны і заплакала". Гісторыя пенсіянера, якога асудзілі па данасе суседа за ўдзел у пратэстах

Затрыманні журналіста, прадпрымальніка, старшыні АСВОДа: хроніка пераследу 13-15 красавіка (дапоўнена)

Зорку "Што? Дзе? Калі?" Фёдара Шведава ў Гродне судзяць за данаты (дапоўнена)

У Баранавічах за ўдзел у паслявыбарчых акцыях пратэсту дзевяць чалавек асудзілі да калоніі

Музыкаў гурта Nizkiz асудзілі да 2,5 гадоў "хатняй хіміі"

Заява аб прызнанні 14 чалавек палітычнымі зняволенымі

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ


Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2024

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Выбары*2024

ВЫДАННІ





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА


РАЦЫЯ


HUMAN
RIGHTS
HOUSE
NETWORK


kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка


fidh


ВЫТОКІ


european platform for democratic elections
epde


ADC
memorial
Anti-Discrimination Centre


МХГ
Московская Хельсинкская Группа


AMNESTY
INTERNATIONAL


МІЖНАРОДНЫ
КАМІТЭТ
ПА РАССЛЕДАВАННІ
КАТАВАННЯЎ
У БЕЛАРУСІ


Беларуская
асацыяцыя
журналістаў
baj.by


VOICE OF BELARUS


БЕЛАРУСКІ
ХЕЛЬСІНКСКІ
КАМІТЭТ


#BYSOL

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY